# Нацыянальная бібліятэка Беларусі рыхтуе факсіміле першага "Буквара"

Сёлета адзначаецца 400-годдзе першага "Буквара" ў свеце. Ён пабачыў свет у друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага брацтва і быў напісаны на царкоўнаславянскай мове. Да яго выдання, хутчэй за ўсё, мелі дачыненне і беларусы. Вялікая верагоднасць таго, што адным з яго аўтараў быў Мялецій Сматрыцкі, вядомы рэлігійны дзеяч Беларусі і Украіны, які праз год, у 1619 годзе, выпусціў сваю "Грамматику". Цяпер у свеце ёсць усяго два экзэмпляры гэтай кнігі. Адзін, няпоўны, знаходзіцца ў Каралеўскай бібліятэцы Даніі. Другі ў поўным аб'ёме захоўваецца ў закрытай бібліятэцы "Мідл Тэмпл" у Лондане. Праект па факсімільным выданні падтрыманы бібліятэкай "Мідл Тэмпл", Пасольствам Вялікабрытаніі ў Беларусі, Пасольствам Беларусі ў Вялікабрытаніі, Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Белінвестбанкам, прадстаўніцтвам Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця ў Беларусі.